ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА
СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 36 (2010) ● Чацвер, 11 снежня 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.



З Днём балгарскіх студэнтаў віншуе адказны сакратар па рабоце з замежнымі студэнтамі Мінгарвыканкома А. К. Юзафовіч. Фота У. Будая.

## ОРГАНАМ НАРОДНАГА КАНТРОАЮ—10 ГОД

Больш чым паўвекавы вопыт Савецкай дзяржавы і шматгадовы вопыт краін сацыялістычнай садружнасці пераканаўча паказваюць, што права народа на кантроль—адна з найвялікшых пераваг, якія сацыялізм прадастаўляе працоўным.

У. І. Леніну належыць заслуга ў навуковым абгрунтаванні аб'ектыўнай неабходнасці кантролю ў сацыялістычным грамадстве. Ён глыбока і усебакова распрацаваў асноўныя прынцыпы народнага кантролю, якія і зараз з'яўляюцца для нас кіраўніцтвам у рабоце.

Зыходзячы з ленінскіх ідэй, Камуністычная партыя пастаянна ўдасканальвае сістэму кантролю ў нашай краіне. XXII з'езд КПСС даручыў Цэнтральнаму Камітэту распрацаваць дзейсныя меры па паляпшэнню і ўдасканальванню партыйнага, дзяржаўнага і грамадскага кантролю з тым, каб ператварыць яго ва усенародны, усеахопны, пастаянна дзейнічаючы і эфектыўны кантроль.

Выконваючы Дырэктывы XXII з'езда партыі, лістападаўскі (1962) Пленум ЦК КПСС прыняў рашэнне аб карэннай рэарганізацыі сістэмы кантролю ў нашай краіне, паклаўшы ў яе аснову ленінскую ідэю аб стварэнні усеабдымнага, пастаянна дзейнічаючага кантролю з удзелам у ім шырокіх мас працоўных. Былі створаны Камітэт партыйна - дзяржаўнага кантролю ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР і адпаведныя органы на месцах.

У снежні 1965 года Пленум ЦК КПСС прыняў пастанову аб пераўтварэнні органаў партыйнага дзяржаўнага кантролю ў органы народнага кантролю. Галоўная мэта гэтага пераўтварэння заключалася ў тым, каб зрабіць органы кантролю адным з дзейсных сродкаў партыі і урада па яшчэ больш шырокаму прыцягненню народных мас да кіравання справамі дзяржавы, забеспячэнню сістэматычнай праверкі выканання Дырэктыў партыі і урада савецкімі, гаспадарчымі і іншымі органамі, умацаванню дзяржаўнай дысцыпліны і сацыялістычнай законнасці.

Цяпер органы народнага кантролю займаюць важнае месца ў сістэме сацыялістычнай дэмакратыі. У краіне дзейнічае больш 1 млн. 200 тысяч груп і пастоў народнага кантролю, у якія выбрана 9 млн. 294 тысячы чалавек. У камітэтах народнага кантролю створана звыш 30 тысяч пазаштатных аддзелаў, у рабоце якіх удзельнічаюць 340 тысяч пазаштатных інспектараў і іншых работнікаў. У БССР зараз дзейнічае больш 41,6 тысячы груп і пастоў народнага кантролю, у якіх працуюць каля 387 тысяч народных кантралёраў. Акрамя гэтага, арганізаваны 1.103 пазаштатныя аддзелы, у якіх працуе больш 13 тысяч пазаштатных інспектараў і іншых работнікаў.

У нашым універсітэце створана 20 груп і пастоў народнага кантролю, у якія выбрана каля 300 народных кантралёраў. Усе яны добрасумленна выконваюць свае грамадскія абавязкі, дапамагаюць адміністрацыі яшчэ лепш наладзіць работу ва універсітэце.

**Я. ТАГУНОЎ,**
**старшыня групы народнага кантролю БДУ.**

## А ЗІМА ЎЖО НАСТУПІЛА...

У пачатку снежня у БДУ адбылося чарговае пасяджэнне мясцовага камітэта, на якім быў заслуханы і абмеркаваны даклад выконваючага абавязкі прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце С. М. Касічэнкі «Аб гатоўнасці вучэбных карпусоў, студэнцкіх інтэрнатаў і іншых бытавых прадпрыемстваў па абслугоўванню студэнтаў і выкладчыкаў да работы ва умовах зімы».

У ходзе абмеркавання выявіліся сур'ёзныя недахопы ў рабоце адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта. Адрамантаваную сталовую № 33, кандытарскі цэх і склады нельга запусціць у эксплуатацыю з-за адсутнасці электраэнергіі. Нездавальняюча наладжана грамадскае харчаванне на філфаку: памяшканне буфета цеснае, асартымент страў невялікі, не заўсёды бываюць гарачыя і малочныя стравы.

Асаблівую трывогу мясцкома выклікае дрэннае забеспячэнне прадуктамі сталовай і буфетаў у Шчамысліцы, таму што там студэнты і выкладчыкі вымушаны карыстацца паслугамі толькі гэтых прадпрыемстваў грамадскага харчавання.

З вялікімі перабоямі выдаецца малако супрацоўнікам, звязаным са шкоднымі ўмовамі працы.

Аддзел забеспячэння ў бягучым годзе не закупіў свяцільнікаў, і таму нельга палепшыць асвятленне ў галоўным корпусе.

Сур'ёзную заклапочанасць выклікае дрэнная работа вентыляцыйных сістэм у 11 лабараторыях хімічнага корпуса. Тут не адрамантавана таксама вадаправодная і каналізацыйная сістэмы, у многіх лабараторыях неабходна тэрмінова адрамантаваць трубы з вініпласту.

Усе гэтыя вялікія і «малыя» недахопы адмоўна ўплываюць на работу многіх лабараторый універсітэта, адцягваюць увагу іх кіраўнікоў ад асноўных заняткаў, дрэнна адбіваюцца на здароўі супрацоўнікаў.

Мясцком не можа не турбаваць і такая «дробязь», як адсутнасць абклеечнай бумагі, паклі, клею. А тым часам халоднае паветра ў аўдыторыях стварае ненармальныя ўмовы для заняткаў. Пералічэнне недахопаў можна было б яшчэ працягваць, але работнікі гаспадарчай часткі універсітэта лепш за іншых ведаюць аб іх. Ведаюць, толькі чамусьці не спяшаюцца ліквідаваць. Не лішне, відаць, напомніць ім, што зіма ўжо наступіла.

**Л. АНДРЭЕВА.**

## АДЧУВАЦЬ СЯБЕ ПАТРЭБНЫМ

Яны не ўвайшлі, а убеглі ў лабараторыю. «Ніякай сур'ёзнасці, скачуць праз дзве прыступкі лесвіцы, як дзеці»,—сказаў іх кіраўнік. Але ў той дзень не варта было чакаць ад іх сур'ёзнасці. Яны скончылі цікавую працу, і ў іх быў добры настрой.

Старшакурснікі фізфака БДУ сур'ёзна займаюцца навуковымі даследаваннямі. Так, на кафедры ядзернай фізікі пад кіраўніцтвам дацэнта В. Ямнага яны па гасдагавору з Ленінградскім электратэхнічным інстытутам сувязі, Кіеўскім політэхнічным інстытутам і радам прамысловых прадпрыемстваў распрацоўвалі і выраблялі універсальныя макеты для адпрацоўкі электронных схем. Гэтыя макеты будуць дэманстравацца на ВДНГ.

А з якім захапленнем удзельнічалі члены СНТ, студэнты III — V курсаў фізфака, у вырабе апаратуры па даследаванню прыродных комплексаў! Гэта праца выканана па гасдагавору з МДУ для міжнароднай экспедыцыі на Гімалаі, якая рыхтуецца ў наступным годзе.

Як уважліва, удумліва і разам з тым з маладым запалам працавалі яны. На пытанне, што прымушае пасля лекцый прыходзіць у лабараторыю, адказалі: «Разуменне, што ты, твае веды патрэбны ўжо цяпер, што ты і зараз можаш прынесці людзям практычную карысць. Тут адчуваеш сябе патрэбным...».

Так, удзел у СНТ дае магчымасць ужо на студэнцкай лаўцы прымяняць атрыманыя веды на практыцы, дысцыплінуе розум, прывучае да творчасці.

І асабліва важна, каб старшынёй СНТ быў чалавек дзелавы і энергічны, зацікаўлены сваёй справай, карыстаўся павагай студэнтаў. Іменна такі малады камуніст, былы асістэнт, а зараз старшы інжынер кафедры агульнай фізікі В. А. Гайсёнак, стаўшы старшынёй СНТ, адразу ўключыўся ў работу. Упэўнены, што без даследчай работы, без удзелу ў СНТ немагчыма стаць добрым спецыялістам, ён многа зрабіў, каб справы членаў таварыства сталі больш эфектыўнымі.

І цяперашні старшыня СНТ аспірант А. Турко з цікавасцю ўзяўся за даручаную справу. Разумна і тонка кіруе ён студэнтамі, дапамагае і словам, і справай. Студэнты бачаць у ім, у сваіх навуковых кіраўніках людзей захопленых, любячых сваю справу, і стараюцца быць такімі ж.

Для членаў СНТ даследчая работа стала патрэбай, неабходнасцю. І, скончыўшы універсітэт, стаўшы спецыялістамі, сённяшнія студэнты будуць з удзячнасцю ўспамінаць сваіх настаўнікаў, якія раскрылі перад імі захапляючы і цудоўны свет—свет навуковых даследаванняў і адкрыццяў.

**С. АГАРОНАВА.**

## У АБАРОНЦАЎ ПАРАДКУ—ЗЛЁТ

25 лістапада адбыўся злёт народных дружыннікаў БДУ, на якім прысутнічаў актыў народнай дружыны універсітэта. Злёт адкрыў яго старшыня, выкладчык факультэта журналістыкі Р. А. Жураўлёў. Пасля выбараў прэзідыума злёту па першаму пытанню «Асноўныя моманты новага Палажэння аб ДНД» выступіў выкладчык, кандыдат юрыдычных навук П. Я. Грынкін. Ён пазнаёміў слухачоў з новым палажэннем аб добраахвотнай народнай дружыне, цікава і падрабязна расказаў аб вытоках і формах яе дзейнасці, прывёўшы шэраг яркіх прыкладаў з гісторыі дзейнасці універсітэцкай дружыны.

Затым дацэнт юрыдычнага факультэта У. П. Сярэбранікаў зрабіў інфармацыю па другому пытанню—«Выбары штаба ДНД БДУ». Ён адзначыў неабходнасць стварэння штаба дружыны для больш аператыўнай і каардынаванай яе дзейнасці.

Злёт аднагалосна выбраў штаб ДНД, у састаў якога ўвайшлі 14 лепшых прадстаўнікоў універсітэцкай народнай дружыны — студэнтаў і выкладчыкаў: У. П. Сярэбранікаў, дацэнт юрфака, камандзір ДНД БДУ; Р. А. Жураўлёў, камандзір ДНД журфака; А. М. Лемешаў, камандзір ДНД філфака; У. М. Яцухна, камандзір ДНД гістфака; Р. М. Блінаровіч, камандзір ДНД юрфака; Я. Ж. Скакоўскі, камандзір ДНД хімфака; М. М. Буян, камандзір ДНД гістфака; Р.М. Блінкоў, камандзір ДНД фізфака; У. У. Кашэўскі, камандзір ДНД мехмата; С. П. Чарноў, камандзір ДНД біяфака: А. А. Левакоў, камандзір ДНД ФПМ; А. П. Пятроў, студэнт юрфака; С. А. Цішкевіч, камандзір аператыўнага атрада ДНД; Т. Каралёва, студэнтка юрфака.

Пасля злёту адбылося першае пасяджэнне штаба дружыны.

**А. ДАНІЛАЎ.**

## ЛЮБІ СВАЮ ЗЯМЛЮ

**На кафедры глебазнаўства і геалогіі геаграфічнага факультэта ужо даўно існуе навукова-даследчы гурток «Глебазнаўца». Шмат карыснага прынёс ён яго членам, дапамагаючы студэнтам пазнаваць новае аб сваёй зямлі, яе нетрах і багаццях. Многія з былых гуртоўцаў працуюць на кафедры універсітэта, у інстытуце аграхіміі і глебазнаўства, у інстытуце геалогіі, у АН БССР.**

**Нядаўна на геафаку адбылося чарговае пасяджэнне гуртка, на якім праходзіў урачысты прыём новага папаўнення — студэнтаў I — II курсаў.**

**Традыцыйным хлебам-соллю сустрэла уступаючых у гурток студэнтка IV курса Дзіяна Куліні̇ч.**

**«Гэта дар зямлі. Але для таго, каб гэты хлеб быў смачней і духмяней, соль яшчэ лепшай, патрэбны вашы гарачыя сэрцы, патрэбны вашы вечныя пошукі».**

**Затым ад імя яго вялікасці «Маналіта і рыдлёўкі» Вандроўнік-даследчык зачытаў тэкст клятвы гуртоўцаў:**

**«Клянёмся свята захоўваць і памнажаць невычэрпныя багацці роднай зямлі, яе неацэнную урадлівасць і жыватворную сілу...»**

**Звонка гучаць словы клятвы. Ад імя новых членаў выступіў Р. Сураўнёў. Ён паабяцаў не здраджваць традыцыям, не падводзіць старое пакаленне.**

**Цёпла сустрэлі студэнты прывітанне ганаровага члена гуртка, акадэміка АН БССР, загадчыка кафедры глебазнаўства і геалогіі БДУ А. Р. Мядзведзева. Ён пажадаў рабятам новых поспехаў і адкрыццяў.**

**Р. ШЫРНА,**
**стараста навукова-даследчага гуртка «Глебазнаўца».**





З прывітальным словам да членаў гуртка «Глебазнаўца» звярнуўся акадэмік АН БССР А. Р. Мядзведзеў.
Фота Т. Петрашкевіч.

# ДРУЖБЫ І БРАТЭРСТВА НАСЛЕДНІКІ

## РАБОТУ КІДа — НА НОВУЮ СТУПЕНЬ

Я ПІШУ гэты артыкул пад вялікім эмацыянальным уражаннем. Яно выклікана цікавымі сустрэчамі, гарачымі спрэчкамі, плённай работай на працягу Тыдня інтэрнацыянальнай дружбы ў Чарнавіцкім дзяржаўным універсітэце.

Па ініцыятыве клуба інтэрнацыянальнай дружбы «Равеснік» тут прайшоў традыцыйны злёт студэнтаў - інтэрнацыяналістаў «Студэнцкі мір-75», прысвечаны Міжнароднаму дню студэнтаў і 100-годдзю універсітэта. У госці да чарнавіцкіх студэнтаў прыехалі іх равеснікі з 11 ВНУ краіны.

Галоўная мэта злёту— абагульненне вопыту работы клубаў інтэрнацыянальнай дружбы краіны, пошук новых форм і метадаў інтэрнацыянальнага выхавання студэнцкай моладзі, вывучэнне праблем міжнароднага студэнцкага руху.

У ходзе злёту была праведзена навукова - тэарэтычная канферэнцыя «Моладзь у барацьбе за мір, дэмакратыю, сацыяльны прагрэс». Мы наведалі рад прадпрыемстваў горада, школьных інтэрклубаў, зрабілі паездку у Хоцін, дзе пабывалі у музеі камсамольцаў-падпольшчыкаў. І, вядома, шмат часу мы удзялілі абмену вопытам. Былі вызначаны формы і метады работы студэнцкіх КІДаў, якія неабходна выкарыстаць і ў нас. У асноўным яны зводзяцца да наступнага:

— правядзенне навукова-тэарэтычных і навукова-практычных канферэнцый па пытаннях інтэрнацыянальнага і патрыятычнага выхавання;

— правядзенне тэматычных вечароў, прысвечаных знамянальным датам і падзеям;

— акцыі салідарнасці: правядзенне мітынгаў і суботнікаў, збор сродкаў і подпісаў у абарону міру;

— узмацненне і расшырэнне сувязей паміж маладзёжнымі арганізацыямі нашай краіны і замежных краін (абмен карэспандэнцыяй, дэлегацыямі, калектывамі мастацкай самадзейнасці, будатрадамі);

— правядзенне фестываляў мастацкай творчасці, спартакіяд сумесна з замежнымі студэнтамі, якія вучацца ў ВНУ;

— правядзенне конкурсаў палітычнай песні, палітычнага плаката;

— удзел у канферэнцыях, інтэрднях, злётах і фестывалях вышэйшых навучальных устаноў;

— арганізацыя і правядзенне сустрэч з цікавымі людзьмі, перш за ўсё са змагарамі-інтэрнацыяналістамі;

— шэфская работа з КІДамі школ, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Паспяховае авалоданне пералічанымі формамі і метадамі работы дапаможа ясней уявіць усю работу КІДаў на факультэтах, папоўніць свае планы новымі цікавымі мерапрыемствамі.

Зразумела, нашы юныя КІДы на факультэтах павінны знайсці падтрымку з боку дэканатаў, партбюро, камітэтаў камсамола факультэтаў, прафсаюзнай арганізацыі ў справе эфектыўнага інтэрнацыянальнага выхавання студэнтаў нашай ВНУ.

**В. СТРАЛЬЦОЎ,**
**прэзідэнт інтэрклуба БДУ «Планета».**

## ЁСЦЬ У НАС ДАРОГА БРАТЭРСТВА



ГЭТЫ дзень балгарскія студэнты называюць сваім. Прыгожая і добрая традыцыя. Маладзеюць вуліцы гарадоў сонечнай Балгарыі — юнацтва адзначае сваё свята. І не толькі ў сябе на Радзіме.

Восьмага снежня кавалачак балгарскага сонца асвяціў беларускую зямлю. Учора балгары прымалі гасцей на дыскатэцы ў інтэрнаце, а сёння гасцінна адкрыты дзверы актавай залы універсітэта для прадстаўнікоў вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў горада і студэнтаў БДУ.

— Калі ласка да нас на свята!

Урачысты сход, прысвечаны Дню балгарскіх студэнтаў, адкрывае лідэр балгарскага зямляцтва Ніколаў.

Першая ў Балгарыі вышэйшая навучальная установа — Сафійскі універсітэт — была утворана ў 1888 годзе, усяго праз дзесяць гадоў пасля вызвалення балгарскага народа ад турэцкай няволі. Універсітэт быў названы імем Клімента Ахрыдскага, настаўніка і асветніка. Дзень святога Клімента выпадаў на 8 снежня, ён і стаў Днём балгарскіх студэнтаў. Але, нягледзячы на сваё рэлігійнае паходжанне, гэты дзень ператварыўся ў адзін з самых светлых рэвалюцыйных свят прагрэсіўнага балгарскага студэнцтва, вырас у яркую дэманстрацыю супраць цара і буржуазнага урада. У цяжкія гады фашысцкай акупацыі балгарская моладзь не страціла рашучасці ў барацьбе за свае правы. І сёння разам з усім народам прагрэсіўнае студэнцтва Балгарыі паспяхова будуе сацыялізм і камунізм.

Ніколаў выказвае вялікую удзячнасць дэканату па навучанню замежных студэнтаў, савету па справах замежных студэнтаў у Мінску, выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта, інтэрклубу «Планета» за дапамогу ў вучобе.

Наша дружба з брацкім балгарскім народам расце і мацнее. Балгарскія студэнты вельмі сур'ёзна ставяцца да вучобы, асабліва да грамадскіх дысцыплін. Па паспяховасці яны абганяюць сваіх землякоў у Маскве, Ленінградзе, Кіеве. Балгары актыўна удзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці, займаюцца ў спартыўных секцыях. Аб гэтым гаворыць у сваім выступленні праруктар па рабоце з замежнымі студэнтамі І. П. Чэпа.

Ад імя Мінскага гарадскога Савета і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР балгарскіх сяброў віншуе адказны сакратар савета А. К. Юзафовіч:

— Усяго некалькі гадоў назад у беларускіх ВНУ вучылася 10—15 балгар, сёння іх ужо 42. Я упэўнены, што нашы сувязі будуць развівацца і ў будучым.

Так, наша дружба непарушная. У знак глыбокай павагі да вялікага правадыра савецкага народа балгарская дэлегацыя усклала ў гэты дзень кветкі да помніка У. І. Леніну. Сярод тых, хто удзельнічаў ва урачыстасці,— студэнты БПІ Русі Найдзёнаў і Пламен Колеў, студэнткі БДУ Ронка Велева і Лідзія Міцава.

Дзень балгарскіх студэнтаў — гэта свята і савецкіх і замежных студэнтаў, якія вучацца ў БДУ.

Гаворыць старшыня савета дружбы Іса Давары, аспірант з Афганістана:

— Мы рады, што можам адзначыць не толькі ваша свята, але і свята усіх студэнтаў свету. Хочацца выказаць падтрымку чылійскім, партугальскім, іспанскім студэнтам, якія не маюць гэтай магчымасці.

Урачыстасць сходу парушае задорны барабанны бой. Гэта піянеры 114-й школы Мінска прыйшлі вітаць старэйшых балгарскіх сяброў. Прыемнай нечаканасцю была песня, якую школьнікі выканалі на балгарскай мове.

Свята закончылася. Яно стала новай прыступкай у знаёмстве з балгарскімі сябрамі, ва умацаванні нашай дружбы.

**А. БАХАНОВІЧ,**
**І. ДРАГОЙЦАВА.**



**НА ЗДЫМКАХ:** выступае Хрыста Ніколаў; балгарскія студэнты усклалі кветкі да помніка У. І. Леніну. Фота У. Будая.

## ЦЯПЛО СТУДЭНЦКІХ ДЗЁН

ЗУСІМ мала часу прайшло з той пары, калі наш Мінск сустракаў сяброў з сонечнай Балгарыі. Фестываль балгара-савецкай дружбы з'явіўся вялікай падзеяй у жыцці нашай сталіцы. Я памятаю святочна убраныя вуліцы, усмешкі на тварах людзей, нават асаблівы пах беларускага паветра, які ў тыя дні нагадваў сваёй духмянасцю ружы.

І вось сёння мне зноў прадстаяла сустрэча з рабятамі з Балгарыі, студэнтамі механіка-матэматычнага факультэта БДУ Весялінай Крыстозавай, Ангелам Панаётавым і Георгіем Таманавым.

Я вельмі хвалявалася перад сустрэчай з імі, але усмешка Георгія Таманава, цёплы позірк Ангела і жыццярадаснасць Весяліны адразу рассеялі хваляванне. Пасля першага знаёмства я папрасіла рабят расказаць аб сабе, аб сваіх занятках.

Яны добра валодаюць рускай мовай.

— Рускую мову мы вывучаем у школе як брацкую. І асаблівай цяжкасці яна для нас не уяўляе, таму што у нашых мовах шмат агульнага,—тлумачыць мне Весяліна Крыстозава.

Весяліна ужо два гады займаецца у нашым універсітэце, і за гэты час, таксама як і ў Георгія і Ангела, у яе паявілася шмат сяброў і знаёмых.

— Савецкія студэнты — самыя лепшыя. Калі б не мае сябры-аднакурснікі, мне было б вельмі цяжка перанесці разлуку з радзімай,— гаворыць Весяліна.

Георгій Таманаў — з Сафіі. У 1971 годзе ён удзельнічаў у міжнароднай матэматычнай алімпіядзе, што дало яму магчымасць паступіць у Сафійскі універсітэт без экзаменаў. А потым, калі яму прапанавалі паехаць для прадаўжэння вучобы ў Савецкі Саюз, з радасцю згадзіўся.

— Я вельмі рад, што вучуся ў Беларускім універсітэце,—гаворыць Георгій. — Мне падабаюцца рабяты, вясёлыя, дружныя, падабаецца цудоўны горад Мінск.

Рабяты добра займаюцца. У мінулым годзе Ангел Панаётаў здаў сесію датэрмінова і усё на «выдатна». Хацелася хутчэй убачыць родную Балгарыю.

— Першы час вельмі цягне дадому, і таму на летні адпачынак мы заўсёды едзем у Балгарыю. Але цяпер прывыклі і стараемся як мага больш даведацца аб Савецкім Саюзе, — гаворыць Весяліна. — Вольнага часу мала, а мне хочацца глыбей пазнаёміцца з вашым мастацтвам. Таму, як толькі выпадае такая магчымасць, я іду ў тэатр, на канцэрт, у музей.

Георгій любіць матэматыку і амаль увесь вольны час аддае рашэнню задач, прыкладаў.

Спорт — таксама любімы занятак рабят. Георгій захапляецца лёгкай атлетыкай, а Ангел аддае перавагу плаванню.

Рабяты часта бываюць на экскурсіях. Яны наведалі ўжо Хатынь, Брэст, Ленінград, Кіеў, Маскву, Рыгу, Вільнюс.

Георгія уразіў сваёй прыгажосцю горад на Няве.

— А мне вельмі спадабалася Рыга, — гаворыць Весяліна. — Яе вузкія, старыя вулачкі напамінаюць мне Плоўдзіў.

Яшчэ шмат цікавага маглі расказаць мне рабяты, але званок паклікаў іх на лекцыю. І перад тым, як развітацца, яны сказалі:

— Калі мы будзем вяртацца ў родную Балгарыю, разам з ведамі, атрыманымі тут, увязём з сабою радасць і цяпло студэнцкіх дзён.

**Л. САДОЎСКАЯ,**
**студэнтка II курса журфака.**







**НА ЗДЫМКАХ:** балгарскія студэнты Георгій Таманаў, Ангел Панаётаў і Весяліна Крыстозава (злева). Фота Т. Петрашкевіч.

# «ВЕРУ Ў СОНЦА ІСПАНІІ»

АГОНІЯ прэстарэлага дыктатара Франка — гэта агонія усяго фашысцкага рэжыму у Іспаніі. Народ маёй краіны пераможа, і я веру у гэта!

Гарачыя, усхваляваныя словы ляцяць у прыціхшую залу. Позіркі слухачоу накіраваны на хударлявага сівавалосага чалавека з незвычайным палымяна-пранізлівым поглядам, які стаіць за кафедрай і усхвалявана, перакануча, з цвёрдай упэуненасцю гаворыць аб непазбежнасці хуткай гібелі рэакцыйнай франкісцкай хунты.

Гэта Хасэ Марыя Флорэс-Фернандэс, дацэнт Мінскага педагагічнага інстытута замежных моу, адданы патрыёт Іспаніі, камуніст, чалавек незвычайна цяжкага, але гераічнага лёсу. Сёння ён прыйшоу на сустрэчу з першакурснікамі факультэта журналістыкі, прыйшоу, каб расказаць юнакам і дзяучатам аб сваёй радзіме—Іспаніі, яе гісторыі і сучаснасці, аб мужнай барацьбе патрыётау краіны супраць фашысцкай рэакцыі, за свабоду і сацыяльна-палітычны прагрэс.

— Недалёка ужо той час, калі уздым рэвалюцыйнай хвалі канчаткова і назаусёды змые са шматпакутнай іспанскай зямлі карычневы бруд фашызму!

Праз некалькі дзён — тады мы яшчэ не ведалі гэтага — газеты прынясуць вестку аб смерці крывавага дыктатара. «Іспанія на парозе грандыёзных здзяйсненняу», «Смерць дыктатара — пачатак гібелі рэжыму», «Шырокія гістарычныя перспектывы» — будуць усхвалявана паведамляць буйныя загалоукі. І тады мы яшчэ раз успомнім яго выступленне і той незвычайны погляд вачэй: вострыя, гарачы, праніклівы, быццам ён глядзеу і бачыу далёка уперад скрозь смугу часу...

— Краіна стаіць напярэдадні вялікіх гістарычных змен, і рана ці позна настане, нарэшце, той доугачаканы дзень, калі над усёй Іспаніяй будзе пасапраўднаму бязвоблачнае неба!

Ён адразу заваяваў сімпатыі аудыторыі. Спалучэнне аб'ектыўнасці і эмацыянальнасці, сур'ёзнасці і гумару, шчырасці і усхваляванасці у яго расказе — усё гэта не магло не спадабацца.

— Няхай у вас не складваецца думка аб Іспаніі як беднай, занядбанай краіне, — кажа Флорэс-Фернандэс.—Мая краіна ніколі не мела недахопу ні у прыродных багаццях, ні у чалавечых талентах. Іспанія дала свету Магелана, Сервантэса, Пікасо...

У краіне ёсць усе умовы для паспяховага развіцця, робіць вывад расказчык. І у тым, што, насуперак гэтаму, Іспанія застаецца адсталай, параунальна слабаразвітай краінай, залежнай эканамічна ад больш магутных імперыялістычных дзяржау і, у першую чаргу, ад ЗША, — у гэтым віна рэакцыйнай фашысцкай хунты, якая дауно ужо зжыла сябе і з'яуляецца тормазам на шляху эканамічнага і сацыяльна-палітычнага прагрэсу краіны.

З гневам і абурэннем гаворыць Флорэс-Фернандэс аб тым, што за гады крывавага тэрору Франка у турмах і фашысцкіх засценках загінула 1.180.000 патрыётау.

Перад вачамі юнакоу і дзяучат паустаюць карціны трывожнай, бурнай, неспакойнай іспанскай рэчаіснасці трыццатых гадоу. Патрыёт цікава і падрабязна расказвае аб расстаноуцы палітычных сіл на арэне грамадскага жыцця Іспаніі таго часу, аб перамозе левых сіл на выбарах 1936 года, аб крывавым мецяжы генерала Франка і трохгадовай няроўнай барацьбе народа супраць ворагау маладой рэспублікі: франкістау, нямецкіх і італьянскіх інтэрвентау.

Флорэс-Фернандэс з цеплынёй і удзячнасцю гаворыць аб вялікай дапамозе савецкага народа брацкаму народу Іспаніі, аб тысячах савецкіх добраахвотнікаў, што адважна змагаліся супраць ворагау новай Іспаніі на вуліцах Барселоны і барыкадах Мадрыда...

Іспанскі народ ніколі не забудзе чырванакрылых самалётау на варце іспанскага неба; заужды будзе памятаць гераічныя подзвігі мужных сыноу Савецкай краіны у радах інтэрнацыянальных атрадау.

У час выступлення ён ні слова не сказау аб сабе, і толькі пазней, калі студэнты пачалі задаваць пытанні, стала вядома, што і сам Хасэ Марыя Флорэс-Фернандэс у тыя трагічныя дні барацьбы не быу у баку ад падзей.

— Я астурыец, — з усмешкай гаворыць ветэран, — а астурыйцы заужды вызначаліся сваёй непакорлівасцю. У мяне нават валасы, і тыя непакорлівыя.

Сын беднага інтэлігента з поўначы Іспаніі, прадстаунік ніжэйшых слаёў іспанскага грамадства, які быу вымушаны цяжкай працай пракладваць сабе шлях у жыцці, — ён не вагауся, калі настау час выбіраць, у якім стане змагацца. Яшчэ да прыходу рэспубліканцау да улады, будучы студэнтам, Хасэ Марыя становіцца сакратаром камсамольскай ячэйкі. А потым яго чакау звычайны у той час лес актыунага рэвалюцыйнага змагара: малады патрыёт трапляе у турму. Доугімі, страшэнна доугімі былі гэтыя тры гады і адзінаццаць месяцау, праведзеныя у халодным і цесным каменным мяшку турэмнай камеры з адзіным вузкім акенцам, скрозь якое быу ледзь бачны маленькі, зацiснуты у іржавае жалеза кратау кавалак змрочнага іспанскага неба.

Але Хасэ Марыя ні на хвіліну не пераставау верыць, што рана ці позна на небе яго радзімы заззяе велічнае сонца свабоды. І гэты доугачаканы дзень настау: зімой 1936 года да улады у Іспаніі прыйшлі левыя сілы, прыйшло вызваленне!

Потым падзеі пачалі разгортвацца са страшнай, незвычайнай сілай і дынамізмам. Пераможаная рэакцыя не скарылася: мяцеж Франка. На дапамогу унутранай контррэвалюцыі прыходзяць Гітлер і Мусаліні.

Флорэс-Фернандэс — цяпер ужо лейтэнант артылерыі рэспубліканскай арміі — змагаецца з ворагамі на поудні Іспаніі. Барселона... Гэта на брук тваіх вуліц упалі гарачыя кроплі маладой крыві, калі фашысцкая куля упілася у цела патрыёта, які падняуся ва увесь рост, каб крыкнуць—у які ужо раз — ахрыплым ад стомы голасам:

— Па ворагах рэспублікі — агонь!

Раненне, канцэнтрацыйны лагер у Францыі, і вось, нарэшце, Хасэ Марыя трапляе у Савецкі Саюз. Тут малады іспанец працягвае вучобу. Але ненадоуга...

Вялікая Айчынная вайна... І зноу Хасэ Марыя Флорэс-Фернандэс там, дзе цяжэй за усё, дзе вырашаецца лёс савецкага народа, таксама як і лёс народа Іспаніі, лёс усіх народау свету, над якімі быу занесены акрываулены меч фашызму...

Фронт, потым славутая партызанская брыгада Канстанціна Заслонава. Тут, у пушчах Беларусі, Флорэс-Фернандэс помсціу за кроу патрыётау на бруку Барселоны, за прабіты кулямі чырвоны сцяг над мадрыдскімі барыкадамі, за шматпакутнае цела сваёй зямлі, здратаванае гусеніцамі танкау, знявечанае бомбамі і снарадамі...

У 1944 годзе — новае, больш цяжкае раненне, доугія месяцы ваеннага шпіталя. Пасля выздараулення Флорэсу-Фернандэсу прапануюць працу выкладчыка іспанскай мовы. І вось былы воін пачынае вучыць юнакоу і дзяучат Савецкай краіны сваёй роднай мове — мове той зямлі, якая нарадзіла і ускарміла яго, мове той дзяржавы, куды ён не мае магчымасці вярнуцца, бо там пануе фашысцкая дыктатура, якая бязлітасна распрауляецца з патрыётамі.

— Але я цвёрда ведаю, што надыйдзе час, калі я змагу свабодна ступіць на вызваленую зямлю радзімы! І гэты час — не за гарамі.

У зале гучыць іспанская мова. Немалады ужо голас набывае новыя інтанацыі, у ім пачынаюць гучаць іншыя, звонкія, сталёвыя ноты. Хасэ Марыя Флорэс-Фернандэс канчае свой расказ вершамі на роднай мове — гэта балада пра Гарсія Лорку. Нельга без унутранага хвалявання слухаць гэты голас, у якім бурляць гнеу і нянавісць, боль і туга, смутак і пратэст... Гэта голас самой Іспаніі, шматпакутнай краіны з суровым лёсам, краіны-змагаркі, якая скрозь усе цяжкасці і нягоды крочыць уперад, насустрач сонцу свабоды.

**А. КЛАСКОЎСКІ,**
**студэнт I курса журфака.**

# ВУЧОНЫ ПАЧЫНАЕЦЦА Ў ВНУ

Калі ты малады, калі імя табе студэнт, значыць ты нясеш з сабою не заўсёды лёгкае, але на дзіва удзячнае шчасце адкрыццяў. Іменна таму і нарадзілася студэнцкае навуковае таварыства універсітэта, нарадзілася, каб працягваць слаўныя традыцыі і мацаваць сваё вечнае права пошуку.

Прайшоў той час, калі прыходзілася агітаваць студэнтау удзельнічаць у СНТ. Сёння навукова-тэхнічная творчасць моладзі ператварылася ў масавы рух, які ахапіў усе факультэты. Дадзім слова статыстыцы. Навукай ва універсітэце займаецца каля 8 тысяч студэнтау. Лічба не малая, і з кожным года яна расце. У мінулым навучальным годзе на Усесаюзны конкурс было прадстаулена 730 работ, на 60 больш, чым у 1973—1974. Асабліва вызначаліся сваёй актыўнасцю студэнты ФПМ. Яны прадставілі на конкурс 16 работ, адна з іх адзначана дыпломам ЦК ВЛКСМ. Другім уладальнікам гэтай узнагароды стала навуковая работа студэнтаў біяфака. З году ў год яны становяцца лаурэатамі конкурсаў, алімпіяд. Асабліва вызначаецца кафедра мікрабіялогіі.

Актывізавалі навуковую дзейнасць студэнты гістарычнага факультэта. У мінулым годзе яны прадставілі на універсітэцкі конкурс 63 работы. Параўнайце — у 1973—1974 навучальным годзе іх было усяго толькі 29. Да гэтага часу слаба удзельнічаюць у конкурсах студэнты філалагічнага факультэта. Факультэт вялікі, а на універсітэцкі конкурс у мінулым годзе было прадстаулена усяго 100 работ.

СНТ БДУ у мінулым годзе было узнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ. Такую ж узнагароду атрымаў за вялікую работу па НДРС член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР прафесар Л. В. Валадзько. Ён стаў лаурэатам Усесаюзнага конкурсу па арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтау. У маі гэтага года за арганізацыю навуковай работы студэнтау Ганаровыя граматы ЦК ВЛКСМ атрымалі вучоныя універсітэта Л. В. Валадзько, У. М. Сікорскі, Ю. К. Фамічоў, В. В. Ізох, Д. М. Саковіч, В. Ф. Якушка, Я. Ф. Ціткоў, Г. М. Браніцкі.

Зацверджаны план работы на новы навучальны год, ідзе вялікая работа на стварэнню праекта новага статута СНТ. У ім знойдуць адлюстраванне пытанні аб членстве, структуры, правах і абавязках удзельнікау СНТ. Кожны старшыня СНТ факультэта атрымаў анкету. Гэта дапаможа на аснове планаў таварыстваў факультэтаў скласці агульны план СНТ універсітэта. Галоўнай задачай сёння, як і раней, застаецца арганізацыя навуковай работы студэнтау. Здольнасці, бадай, ёсць у кожнага, толькі не заўсёды яны знаходзяць рэальнае прымяненне. А імкненне да творчасці, пошук новага былі для моладзі заўсёды вызначальнымі.

**І. АБРАМОВІЧ,**
**студэнтка II курса журфака.**



Лекцыю па гісторыі рускай літаратуры чытае Людвіг Аляксандравіч Ванковіч.

Фота **В. Драчова.**

ТВОЙ ЭТЫКЕТ

# НЯЎЖО ТАК МОЖНА?

Артыкул П. Савасцёнкі «З чаго пачынаецца выхаванасць», надрукаваны у № 32 за 13 лістапада г. г., даў падставу для некаторых разважанняў.

...Малады выкладчык у каторы раз прабег позіркам па тварах студэнтау.

— Хто падрыхтаваў гэта пытанне?

Аудыторыя маўчала. Адзін упарта разглядвау надпісы на парце, другі нахабна, з ухмылкай, глядзеў выкладчыку прама у вочы.

— Няўжо ніхто нават не зазірнуу у падручнік?

Чалавек ужо нервавау. Заўважыць гэта было цяжка, але напрактыкаванае вока студэнта бачыла ўсё.

— Як жа, чыталі...

І амаль кожны думау: так, чытаў, але не настолькі, каб «вылезці» перад усёй аўдыторыяй з адказам. Буду пыкаць-мыкаць, абсмяюць... А я ж маю асабістую годнасць, паважаю сябе...

Клопат аб тым, каб не ўраніць гонару асобы, засланіў павагу да другога чалавека — выкладчыка. Не падрыхтаваўшыся да практычных заняткаў, студэнт ужо гэтым абразіў яго. Сарваліся намечаныя планы, загадзя прадуманыя пытанні для дыскусіі, старанна падабраныя прыклады. Галоўнае—надоўга сапсаваны настрой, зарадзіліся сумненні ў сваім аутарытэце, што, згадзіцеся, асабліва немалаважна для аспіранта, маладога выкладчыка. Але гэта яшчэ не усё. Паводзіны студэнтау на занятках падвоілі крыўду.

Павага да выкладчыка... Успомніце, з якім алімпійскім спакоем гарталі вы прама перад яго сталом часопіс або газету. Што ён можа вам зрабіць? Адабраць часопіс, паскардзіцца у дэканат? Дробязі! Да сесіі усё забудзецца, ды і прымаць экзамен будзе іншы выкладчык. Успомніце, як палка вы пераказвалі суседу па парце, забыўшыся на лекцыю, апошні футбольны матч. У тую хвіліну гэта была найважнейшая падзея. А лекцыя? Яе можна знайсці у падручніку.

Ганебная бескультурнасць! Самае парадаксальнае: у такіх выпадках кажуць, што ... паважаюць чалавека за кафедрай, нават любяць яго. Як сумясціць гэта з толькі што прыведзенымі прыкладамі? Прычына, пэўна, крыецца у нашай псіхалогіі. У аудыторыі студэнтау маса. І яны добра ведаюць, як цяжка пракантраляваць паводзіны кожнага ў час лекцыі. Бедаюць і карыстаюцца гэтым.

Калі ты з выкладчыкам адзін на адзін, ніколі не прыйдзе думка выняць грабенчык і пачаць займацца асабістай прычоскай. Іншая справа — калі сядзіш на апошняй парце у перапоўненым пакоі. Мы лічым сябе выхаванымі людзьмі — куды ж знікае наша «выхаванасць» у калектыве, у тым выпадку, калі гэты калектыў міжволі прыкрывае ўчынкі?

Выхаваць сябе самога. Трэба дадаць: выхаваць сябе не на пэўны адрэзак часу у суткі, а назусім. Культура—унутраная патрэба чалавека. Правільна кажуць: яна не для іншых, яна для сябе.

**С. УСЦІНОВІЧ,**
**студэнт.**

# ІДЗЕ НАВАСЕЛЛЕ

Новы трынаццаціпавярховы будынак інтэрната, што на Кастрычніцкай вуліцы, гудзе, як растрывожаны вулей. З самай раніцы да позняга вечара дзверы амаль не зачыняюцца. Адзін за адным, а часам і цэлым патокам ідуць студэнты з сумкамі, сеткамі і нават мяшкамі. Дзяжурны вахцёр не паспявае адказваць на самыя розныя пытанні, якія цікавяць будучых гаспадароў інтэрната. То там, то тут збіраюцца групкі навасёлаў з радаснымі тварамі, яны жыва дзеляцца сваімі першымі уражаннямі аб іх зусім новым доме, пакоях, сваіх суседзях. Карацей кажучы — ідзе засяленне.

Давайце ж разам з вамі акунемся ў гэтую бегатню, пабываем у самых бойкіх месцах інтэрната, паназіраем за яго яшчэ зусім маладым жыццём.

...Прывычна зарыпелі дзверы. Увайшлі чатыры дзяўчыны, цягнучы за сабой свой скарб.

— Ой, дзяўчаткі, больш не магу, — застагнала адна з іх і паставіла свае рэчы на падлогу. За ёй, каб перавесці дыханне, спыніліся і астатнія.

— З якога факультэта? — пытаецца ў іх дзяжурны вахцёр.

— З хімічнага, — адказала тая, што спынілася першай, і спалохана дадала: — Гэта ж аж на трынаццаты паверх падняцца трэба!

І хаця вышыня вялікая, дзяўчаты, сабраўшы апошнія сілы, рынуліся ўверх па лесвіцы (ліфт часова не працуе). Яны пайшлі, а у дзвярах паказаўся новы паток студэнтаў. Хлопцы таксама з сумкамі, сеткамі, вешалкамі, гантэлямі і нават... штангай гуськом пацягнуліся наверх.

Спакойна і упэўнена ідуць толькі асобныя студэнты. Адразу відаць — журналісты. Яны перасяліліся самымі першымі і цяпер адчуваюць сябе тут сапраўднымі гаспадарамі.

...А тым часам на другім паверсе да пакоя каменданта падыходзяць усё новыя і новыя людзі. Кожны стараецца хутчэй уладкаваць свае справы.

— Цішэй вы, — звяртаецца да іх камендант.

Студэнты крыху супакоіліся, але ненадоўга. Дзе ж тут будзеш маўчаць, калі сабралася столькі знаёмых, з якімі так хочацца падзяліцца сваімі уражаннямі.

Велізарная чарга і каля пакоя, дзе кастэлянша выдае пасцель. Шум, гаворка, а часта і спрэчка з тымі, хто стараецца «пралезці» без чаргі. Адзін за адным нясуць навасёлы радыё, мэблю, падушкі, коўдры, вёдры, венікі і іншыя прадметы, якія так патрэбны у быце.

Але найбольш смеху і весялосці на вышэйшых паверхах, куды засяляюцца хімікі і біёлагі. Студэнты прыбіраюць пакоі, робяць сваё жыллё прыгожым і утульным. Дзе-ні-дзе чутны нават песні. Яны і тут дапамагаюць працаваць.

...Вечар. Адзінаццатая гадзіна. Усё радзей стукаюць уваходныя дзверы. На заселеных паверхах загарэлася святло, многа святла. А будзе яшчэ больш, таму што заўтра зноў патокам будуць ісці студэнты, і таксама будзе такі ж рух, такая ж мітусня.

Наваселле працягваецца!

**І. КУКСА,**
**студэнт II курса журфака.**

## ПЕРШАЯ КНІГА ПАЭТА

# А ШЧАСЦЯ ЛЁГКАГА НЕ ТРЭБА

Пагартайце старонкі першага зборніка вершаў маладога паэта Генадзя Пашкова «Кляновік»—і на вас быццам дыхне свежым вясновым ветрам. Усе вершы зборніка аб'яднаны вялікай і бясконцай тэмай — тэмай неадольнай радасці жыцця, удзячнасці Радзіме, павагі да людзей працы.

**Зялёнай веяй лядзы замяло,**
**брусніцамі ірдзее баравінка.**
**Скрозь дзеразу прабілася травінка**
**і выпрастала лісціка крыло.**

Калі прачытаць уважліва гэтыя радкі, можна заўважыць, з якой пяшчотай гаворыць аўтар пра ўсё такое роднае, блізкае, дарагое. Зусім звычайныя словы набываюць больш шырокі сэнс. Мы разумеем, што і баравінка, і травінка, і лісцік — гэта часцінкі таго велізарнага цэлага, што завецца з ранняга дзяцінства знаёмым і незвычайна прыгожым словам — Радзіма.

У «Кляновік» увайшло шмат вершаў пра вайну. У іх гучыць удзячнасць нашчадка, які схіляе галаву перад народам-воінам, што заслаў сваімі грудзьмі жыццё. Паэт не ўсё перажыў, «бо сорак восьмы — дата нараджэння». Але ён адчуў той пякельны жах,

**што над зямлён няшчадна пракаціўся, —**
**яго скразны і несціханы боль**
**асколачкам ля сэрца варушыўся.**

Вайна забрала ў Г. Пашкова вельмі дарагога і роднага чалавека—бацьку («з апошняга не вернецца шпіталя ён»). Іменна праз вобраз бацькі асэнсоўвае аўтар «Кляновіка» ваенныя падзеі. У вершы «Пачатак» і журба, і боль страты, і гонар за блізкага чалавека, і вялікае жаданне быць вартым памяці бацькі-героя.

**Ад тых партызанскіх світанняў**
**пачатак маіх дарог.**

Гэта да многага абавязвае: не проста помніць аб подзвігах бацькоў, а рабіць усё ў імя мірнага жыцця.

Вершы паэта вызначаюцца эмацыянальнасцю, усхваляванасцю. Аўтар адчуў усю паўнату чалавечага шчасця — шчасця жыць на радзімай зямлі, дзе нават дзень «пахне праталінай лясной», шчасце «быць каласком у роднай ніве».

**Я — чалавек.**
**Я многа значу.**
**. . . . . . . .**
**Я ўсё магу,—**

заяўляе паэт, і разам з яго голасам гучыць голас самой маладосці. Сапраўды, у 20—30 гадоў усё пад сілу, усё па плячы! Аптымістычным настроем прасякнуты многія вершы.

Аўтар не можа ўявіць сябе без пушчы думнай, зорнай мроі, без рук каханай, без вакзалаў, без памяці светлай аб людзях, «каго заранка не разбудзіць».

Мы бачым, як многа трэба таму чалавеку, які не згаджаецца жыць ціха-мірна у цесным мяшчанскім коле, а імкнецца на прастор жыцця, хоча быць заўсёды у палёце. Такі чалавек не ідзе пракладзенымі сцежкамі, а выбірае больш цяжкі жыццёвы шлях. Часам яму даводзіцца вырывацца

**...з кругоў заблытаных няўдач**
**з самім сабою у нязгодзе,—**
**каб толькі голас перадаць**
**другім грудзям,**
**другім стагоддзям...**

Пранікае паэт і ў свет чалавечых адносін. Вершы пра каханне кранаюць самыя тонкія струны душы. Прычым у Пашкова яны маюць элементы казачнасці, рамантычнасці, нават прыгодніцтва. Тым самым аўтар стараецца падкрэсліць усю незвычайнасць гэтага дзіўнага пачуцця.

Я не буду сцвярджаць, што ў «Кляновіку» усё вельмі гладка. Але першая кніга дае усе падставы меркаваць, што паэт будзе творча расці, падымацца на новыя вышыні.

**Т. ГАЎРУСЁВА,**
**студэнтка I курса журфака.**

## ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ



Не спісвай!



Цікава, што там у суседа?

Фота А. Басава.

# ВУЧОБА... НА ГАСПАДЫНЮ

Спрытныя жаночыя рукі бясшумна гаспадараць на стале. Вось на прыгожым, светла-ружовым абрусе паяўляюцца самавар, прыгожыя, залацістыя кубачкі, талерачкі. Акуратна раскладзены нажы, відэльцы... Стол накрыты, застаецца запрасіць гасцей...

Дзесяткі дзявочых вачэй уважліва сочаць за кожным рухам гаспадыні, што упэўнена завіхаецца ля стала. Лідзія Мікалаеўна Хаменка, выкладчыца мінскага кулінарнага вучылішча, паказвае сваё майстэрства студэнтам БДУ, якія жывуць у інтэрнаце № 4. Тут пачынае сваю работу школа кулінарнага майстэрства. Арганізатары школы — студэнцкі клуб філфака, створаны пры інтэрнаце, партыйная арганізацыя факультэта, камітэт камсамола. На факультэце большасць дзяўчат, а гэта будучыя гаспадыні, носьбіты прыгожага і пяшчотнага, таму стварэнне школы — не выпадковасць.

Першыя заняткі... Пытанні сервіроўкі чайнага стала і этыкі паводзін за сталом.

— Піццё чаю — рускі нацыянальны звычай, прыкмета шчырасці і радушша, — расказвае Лідзія Мікалаеўна. — Каб стварыць адпаведны настрой, трэба нават колер абруса падбіраць у адпаведнасці з часам сутак. Раніцой — лепш ружовы, днём — блакітны. Правільная сервіроўка стала выклікае добрыя пачуцці, дапамагае ў сяброўскай размове. Гэта патрэбна умець кожнаму, а будучым гаспадыням асабліва.

Нават у дарэвалюцыйны час, калі у багатых дамах была прыслуга, накрываць стол к чаю лічылася справай гаспадыні.

Усебакова развітая асоба не ўяўляецца без ведання этыкету за сталом. У жыцці чалавека бывае шмат урачыстасцей. Часта сябры і знаёмыя збіраюцца разам, каб сустрэць свята. Для кожнага чалавека веданне правіл паводзін у гасцях або прыёму гасцей з'ўляецца важным і неабходным. Ад гэтага залежыць настрой.

Уважліва слухаюць дзяўчаты захапляючы расказ. У своеасаблівай анкеце Лідзія Мікалаеўна папрасіла дзяўчат задаць пытанні, якія іх цікавяць. А пытанні разнастайныя: якія стравы можна прыгатаваць з бульбы, як зрабіць торт, як варыць фасолю, як прыгатаваць розныя напіткі. Лідзія Мікалаеўна раіць, якую літаратуру можна прачытаць. Яна улічвае пажаданні студэнтаў, абяцае ў наступны раз прынесці некалькі рэцэптаў прыгатавання страў.

Наперадзе вучаніц школы чакае шмат карыснага. Перад Новым годам будзе разгледжана пытанне падрыхтоўкі да святочнага стала, зыходзячы з магчымасцей студэнтаў. На заключных занятках будзе арганізавана выстаўка страў, прыгатаваных студэнтамі. Кожны зможа паказаць сваё майстэрства, веды.

На жаль, на першыя заняткі прыйшлі толькі дзяўчаты. Прадстаўнікі мацнейшага полу, відаць, засаромеліся, стаяць ля дзвярэй. Але ж ведаць правілы этыкету і некаторыя сакрэты кухні патрэбна і ім.

Школа кулінарнага майстэрства запрашае усіх жадаючых.

**А. ТРАФІМОВІЧ.**

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красно го Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 06777 Заказ № 1785.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.